# Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў

лекцыя 1

# ЗМЕСТ

I. Беларуская мова як славянская і “неславянская”.

II. Чляненне і склад славянскіх моў. Ацэначная колькасць носьбітаў розных славянскіх моў.

IIa. “Новыя” славянскія мовы.

III. Адрозненне мовы ад дыялекта.

IV. Прызнанне беларускай і іншых славянскіх моў на міжнародным узроўні.

V. Стытыстычныя звесткі пра беларускую мову

# I Беларуская мова як славянская і “неславянская”.

**Ёган Хрыстаф Адэлунг, Мітрыдат, або Агульная моўная вестка, т. 2 (Берлін, 1809):** крывічы... не належаць ні да вялікарусаў, ні да маларусаў; хутчэй неславяне. Спачатку жылі паміж рэкамі Прыпяць і Дзвіна, аднак пашырыліся да рэк Волга, Ака і Днепр. Пазней трапілі пад Літву і з таго часу называюцца літоўскія рускія... Маюць сваю асаблівую, аднак вельмі мала вядомую гаворку, якая перамешана з польскай”

**Яўхім Карскі 1903**: «даволі забаўнае меркаванне»

## II Чляненне і склад славянскіх моў. Пытанне колькасці славянскіх моў. Ацэначная колькасць носьбітаў славянскіх моў

1. Супрун, Калюта. Уводзіны ў славянскую філалогію. Мінск 1981

2. Die Slawischen Sprachen, Salzburg, 1996 (DSS)

3. Encyklopedie jazyků Evropy. Praha, 2002  (EjE)

4. Ляшчынская В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка. Мінск, 2003

## 1. Супрун, Калюта. Уводзіны ў славянскую філалогію 1981: 12 сучасных славянскіх моў

0. праславянская, 00. стараславянская, 000. старажытнаруская, 0000. палабская

1. руская 2. беларуская 3. украінская

4. балгарская 5. сербахарвацкая 6. славенская 7. македонская 8. русінская

9. польская 10. чэшская 11. славацкая 12. лужыцкая

## 2. Die Slawischen Sprachen, Salzburg, 1996: 16 сучасных славянскіх моў

0. Старабалгарская 1. баснійская 2. балгарская 3. бургенладска-харвацкая 4. кашубская 5. харвацкая 6. македонская 7. польская 8. русінская (Russinisch) 9. руская 10. сербская 11. славацкая 12. славенская 13. лужыцкая 14. чэшская 15. украінская 16. беларуская

# 3 групы славянскіх моў

| | Зах-слав. | Пўдн.-слав. | Усх.-слав. |
|---|---|---|---|
| паўнагалоссе / непаўнагалоссе = *ro, ło-le / ра, ла / ара-аро, ала-ало* | пол. *mróz, broda, proch, mleko, głód, słoma, ogród* | балг. *мраз, брада, прах, млако, глад, град* | бел. мароз, барада, порах, малако, голад, салома, агарод |
| **(k)t + j = c/щ/ч* | *świeca, noc* | *свеща, нощ* | *свяча, ноч* |
| **d + j = dz/жд/ж* | sadza, między | сажда, между | *сажа, мяжа*, ~~рус. *между*~~ |
| *gv- | *kwiat, gwiazda* | *цвете, звезда* | ~~бел. *кветка*,~~ рус. *цветок, звезда* |

# 3 групы славянскіх моў: паўднёваславянская

| | назвы моў | DSS | Супр | Ляшчын | EjE |
|---|---|---|---|---|---|
| 0 | старабалгарская | + | ст-сл | ст-сл | ц-сл |
| 1 | балгарская – 9 млн. | + | + | + | + |
| 2 | македонская – менш, як 2 млн. | + | + | + | + |
| 3 | сербская – 10 млн. | + | + | + | + |
| 4 | харвацкая – 4 млн. | + | | | + |
| 5 | баснійская – EjE: афіц. назва серб-харв. у БіХ; усё нас-ва – 3, 8 млн. | + | – | – | + |
| 6 | славенская – менш, як 2 млн. | + | + | – | + |
| | русінская – 30–35 тысяч | | + | – | |

# 3 групы славянскіх моў: паўднёваславянская

паўнагалоссе/непаўнагалоссе: балг. *м**ра**з, **сла**ма, г**ра**д*

спалучэнне *t + j*: балг. све**щ**а

# 3 групы славянскіх моў: заходнеславянская

| | назвы моў | DSS | Сyпр | Ляшч | EjE |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | польская – 35 млн. | + | + | + | + |
| 8 | кашубская – 200–500 тысяч | + | – | + | + |
| 9 | чэшск. – амаль10 млн. | + | + | + | + |
| 10 | славацкая – 5 млн. | + | + | + | + |
| 11-12 | лужыцкая (верхнялуж. і ніжнялуж.) – менш, як 100 тысяч | Sorb. | 2 | + | + |
| | палабская | – | + | + | + |

# 3 групы славянскіх моў: заходнеславянская

паўнагалоссе/непаўнагалоссе: польск. *m**ró**z, s**ło**ma, og**ró**d*

спалучэнне *t + j*: *św**ie**c**a***

# 3 групы славянскіх моў: усходнеславянская

| | назвы моў | DSS | Сyпрун | Ляшчынская | EjE |
|---|---|---|---|---|---|
| 13 | беларуская – 7 млн./3 млн. 370 тыс./10 млн. | + | + | + | + |
| 14 | украінская – 30-32 млн. | + | + | + | + |
| 15 | руская – 144 млн. | + | + | + | + |
| 16 | русінская – да 900 тыс. у рэгіёне | Russin | – | – | + |
| | старажытнаруская | | + | | |
| | заходнепалеская (згадваецца ў артыкуле пра бел. мову) | – | – | – | + |

# 3 групы славянскіх моў: усходнеславянская

паўнагалоссе/непаўнагалоссе: бел. *м**аро**з, с**ало**ма, аг**аро**д*

спалучэнне *t + j*: *свя**ч**а*

| | назвы моў | DSS | Супрун | Ляшчынская | EjE |
|---|---|---|---|---|---|
| 0 | старабалгарская | + | ст-сл | ст-сл | ц-сл/ст-сл |
| 1 | балгарская – 9 млн. | + | + | + | + |
| 2 | македонская – менш як 2 млн. | + | + | + | + |
| 3 | сербская – 10 млн. | + | + | + | + |
| 4 | харвацкая – 4 млн. | + | | | + |
| 5 | баснійская – EjE: афіц. назва сербскахарвацкай у БіХ | + | – | – | + |
| 6 | славенская – менш як 2 млн. | + | + | – | + |
| | русінская – 30–35 тысяч (мікрамова) | | + | – | |
| | | | | | |
| 7 | польская – 35 млн. | + | + | + | + |
| 8 | кашубская – 200–500 тысяч | + | – | + | + |
| 9 | чэшская – амаль 10 млн. | + | + | + | + |
| 10 | славацкая – 5 млн. | + | + | + | + |
| 11-12 | лужыцкая – менш як 100 тысяч | Sorb. | 2 | + | + |
| | палабская | – | + | + | + |
| | | | | | |
| 13 | беларуская – 7 млн./3 млн. 370 тыс./10 млн. | + | + | + | + |
| 14 | украінская – 30-32 млн. | + | + | + | + |
| 15 | руская – 144 млн. | + | + | + | + |
| 16 | русінская – да 900 тыс. у рэгіёне | Russin | – | – | + |
| | старажытнаруская | | + | | |
| | заходнепалеская (згадваецца ў артыкуле пра бел. мову) | – | – | – | + |
| | | | | | |

## IIа “Новыя” славянскія мовы. “Заходнепалеская” мова. “Падляшская” мова.

русінская – (Павел Магочы, Канада, 1990-я)

сербская

харвацкая

баснійская

“чарнагорская” (?)

сілезская        мараўская

# ***Русінская*** (паводле аўстрыйскага тома):

*Rusinisch* (у *DSS -- Russinisch*), таксама *Ruthenisch* – агульнае паняцце для назвы карпацкіх гаворак:

пўд.-зах. Украіна (магчыма, 650 тыс.); лічыцца украінскай

пўд.-усх. Польшча (60 тыс.);

пўн.-усх. Славакія (130 тыс.);

пўн. Румынія (афіцыйна 1 тыс., неафіцыйна – 20 тыс.)

Венгрыя (5 тыс.) Чэхія (5 тыс.)

Магочы 1995: усяго разам з дыяспарай – 1,5 млн., “наймаладзейшая славянская літаратурная мова”

## “**заходнепалеская**” – (Мікола Шаляговіч, 1986)
## “падляшская” – (Ян Максімюк, Прага, 2008?)

«заходнепалеская» згадваецца ў «Encyklopedie jazyků Evropy» брытанскім аўтарам: з канца 1980-х былі спарадычныя спробы даць заходнепалескаму дыялекту (беларускай мовы) статус літаратурнай мовы... Выйшла некалькі нумароў газеты «*Збудінне*»

# III. Адрозненне мовы ад дыялекта. М. Вайнрайх аб адрозненні мовы ад дыялекта.

“Мова – гэта (такі) дыялект, які мае войска і флот” Макс Вайнрайх

# IV. Прызнанне беларускай і іншых славянскіх моў на міжнародным узроўні.

у Еўропе 143 мовы, з іх 44 (31 %) – “мільённыя”, 15 (11 %) – «карлікавыя»

**1815 (Венскі кангрэс) – у Еўропе было 13 моў (у тым ліку 2 слав.)**: франц., ням., рус., пол., тур., швед., дацкая, нідэрл. англ., ісп., партуг., італ., лацінская (у Ватыкане)

**1919 (падпісанне Версальскай мірнай дамовы) – 27 (у тым ліку 7 слав.)**: нарвеж., фін., літ., латыш., эст., беларус., укр., чэш., румын., венг., сербахарв., балг., албан., грэчаская

**1945 (Патсдамская канферэнцыя) – 36 (у тым ліку 10 слав.)**: малд.. ісланд., фарэр., ірл., слвц., слвн., макед, рэта-рам., мальційская

## V. Статыстычныя звесткі пра беларускую мову: перапісы і іншая статыстыка

перапіс 1989 г.: 77 % нас-ва Беларусі (у тым ліку 6, 5 млн. беларусаў) лічыла сваёй роднай беларускую мову; 1, 2 млн. назвалі беларускую мову другой, якой яны валодалі.

перапіс 1999 г.: **7 млн.** беларусаў (з 8 млн. 160 тыс.) лічылі сваёй роднай беларускую мову (колькасць вырасла на паўмільёна), **3 млн. 373 тыс.**: дома размаўляюць па-беларуску

крытэрый “носьбітаў мовы” – крытэрый “карыстальнікаў мовы”

многія рэцэптыўныя двухмоўныя людзі разумеюць і могуць чытаць, але не ўмеюць гаварыць

**Харман 2002**: у Беларусі ўжываецца 10 моў, беларускамоўныя – 7-8 млн., 2-3 млн. – рускамоўныя, 200–500 тыс. – польскамоўныя, украінамоўныя, 10-20 тыс. – ідыш, 5-10 тыс. – літоўская, мардоўская, татарская, цыганская, 2-5 тыс. – армянская

# Пытанні і заданні для самакантролю:

1. Ці лічылі калі-небудзь беларускую мову неславянскай?

2. Пералічыце славянскія мовы, назавіце ацэначную колькасць носьбітаў кожнай з іх. "Новыя" славянскія мовы. Ахарактарызуйце праблему так званай "палескай мовы".

3. Як адрозніць мову ад дыялекта? Выказванне М. Вайнрайха наконт адрознення мовы ад дыялекта.

4. Калі адбылося прызнанне беларускай мовы на міжнародным узроўні?

5. Дадзеныя перапісу 1999 года: колькасць беларусаў, якія прызналі беларускую мову роднай; колькасць людзей, якія сцвердзілі, што карыстаюцца беларускай мовай дома.

# VI Дадатак

***Польская:*** ёсць насавыя, дзеканне

***Кашубская*** (Гданьскае памор’е і Заходняе Памор’е; сучасны арэал моцна звузіўся; паводле аўстр. энцыкл., 200–500 тысяч

***Лужыцкія:*** Бауцэн/Будышын і Котбус/Хоцебус

Трафімовіч 1989: у Дрэздэнскай і Котбускай акругах складалі 1/6 частку насельніцтва. Цяпер: Саксонія і Брандэнбург

***Македонская:*** Аформілася з 1944 г. Як была ўключана ў кнігу Супруна-Калюты, балгары прыслалі пратэст. У Сафіі ёсць інстытут македонскага дыялекта балгарскай мовы.

***Сербская:*** *bunovati* ‘гаварыць нязвязна’ – *бунаваць* ‘сварыцца’; *завргнути* ‘развіць зачатак плода’ – *заворгваць* ‘нарываць’; *глома* ‘нешта груваcткае, нязграбнае’ – *глюма* ‘нязграбная дзяўчына’, *гламаваты* ‘дурнаваты’; *krivela* ‘крываногі’ – *крывель* ‘кульгавы, крываногі’; *oblutak* ‘галька’ – *аблуткі* ‘бліны’; *уторач* ‘інструмент для наразання пазоў у бочках’ – *уторыч* ‘тс’. Кірыліца, але мае *j*

***Харвацкая:*** Чакаўскі і кайкаўскі дыялект, на якіх ёсць часопісы з мастацкай творчасцю

***Баснійская:*** 1995, Ню Ёрк: «Bosnian-English English-Bosnian Dictionary»

***Славенская:*** мясцовы варыянт *Windisch* ужываецца ў Аўстрыі (5-10 тыс.) (акрамя таго, што ў Аўстрыі ёсць уласна славенская – 20–50 тыс.)

**Безлай**: *Мазыр – Mozirje* ёсць аканне і пераход *л* у *ў*